КОЛАСАВЫ ЎСМЕШКІ

Да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **8.** Сэрца весяліцца, і ... цвіце (прык.). **9.** «... тхор — выжыга // Толькі выскаляўся, // А лісок, псялыга, // Сосмеху качаўся: // Ой, звяры, вы, мае братцы! // Памажэце мне смяяцца!» З вершаванай казкі Я. Коласа «Дзед і мядзведзь». **10.** Вожык што сонца — у ... не возьмеш (прык.). **11.** «Усмешка — ... душы». М. Антрым. **12.** «І чуецца радасны ... — // Гукае Міхась: «Баравік!» З паэмы «Міхасёвы прыгоды». **14.** Пакаты спуск. **15.** Не ... корміць, а ніва (прык.). **16.** Тое, што кажуць не ўсур'ёз, а для таго, каб павесяліцца. **18.** Хітры, як ..., а баязлівы, як заяц (прык.). **19.** «Хвіга двойчы ўжо схадзіла, // Двойчы ім ... чапіла». З верша паэта «За дождж». **22.** Калючы ёрш, ды ... з яго смачная (прык.). **24.** Цвёрды мінерал. **26.** ... лепш за багацце (прык.). **30.** Від цвёрдага паліва. **31.** Мучністы вуглявод, шмат якога ўтрымлівае бульба. **32.** Прыстасаванне, па якім сцякае вада.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: «Рыба з радасці такой // Пайшла ў скокі талакой, // А за ёю ..., // Наварыўшы кашкі». З вершаванай казкі «Рак-вусач». **2.** «І — ха-ха-ха —зарагаталі. // — А каб вы, ..., не даждалі! // Гаворыць дзядзька, сам смяецца». З паэмы «Новая зямля». **3.** Горад на Міншчыне, раённы цэнтр. **4.** Статуя, якой пакланяліся як бажаству. **5.** Паўднёвая расліна з духмянымі пладамі. **6.** «— Ой ты, куме, мой ..., // Бадай табе трасца ў бок ! // А бадай ты не даждаў». З верша «Ігрышча». **7.** «А збоку чмыша бык ..., // Хвастом матаючы сярдзіта». З паэмы «Новая зямля». **13.** Ласка — не ..., сядзеш, не паедзеш (прык.). **14.** Чужая ... — цёмны лес (прык.). **15.** «Вывеў цешчу ён вон з хаты // Ды ў барону яе ўпрог ! // Аж браздзіць у цёшчы пяты, // Проста ... курыць з-пад ног». З верша «Зяць». **17.** «Ну, такі каток харошы, // Як драпянка за ... грошы». З верша «Савось-распуснік». **20.** «З-за вугла вылазіць Рудзька. // — Гаў-гаў-гаў — давай брахаць. // За хвост каня кусае ... — // Ні адцягнуць, ні адагнаць». З байкі Я. Коласа «Конь і сабака». **21.** Тое, што і рэдзь. **23.** «Які ты, хлопча, нецярпячка, // Няхай цябе затопча ...». З паэмы «Новая зямля». **25.** «І так, бывала, наясіся, // Што хоць на пупіку круціся; // Усіх цягнула ў ... к цётцы». З паэмы «Новая зямля». **27.** Каб не ..., не адзежка, было б грошай поўна дзежка (прык.). **28.** Дабро пушыць, а ... сушыць (прык.). **29.** Языком, як ... хвастом (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ
Па гарызанталі: 8. Твар. 9. Зноадзень. 10. Рукі. 11. Пацаўнак. 12. Крык. 14. Скат. 15. Поле. 16. Жарт. 18. Ліса. 19. Насіл. 22. Ёшка. 24. Арат. 26. Весялосць. 30. Кокс. 31. Кружмаг. 32. Цёк.
Па вертыкалі: 1. Пташкі. 2. Пальмы. 3. Уяда. 4. Ідал. 5. Аіва. 6. Кумок. 7. Міхіта. 13. Калянка. 14. Старана. 15. Пыл. 17. Трэ. 20. Цюцька. 21. Стогка. 23. Ёжка. 25. Госці. 27. Ежка. 28. Ліха. 29. Цяпё.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.14	17.32	9.18
Віцебск —	8.07	17.17	9.10
Магілёў —	8.04	17.22	9.18
Гомель —	7.56	17.23	9.27
Гродна —	8.28	17.48	9.20
Брэст —	8.24	17.53	9.29

Месяц

Поўня 4 лістапада.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Пелагеі, Анатоля, Дзям'яна, Сяргея, Уладзіміра, Фёдара, Якава.*
К. *Сільвіі, Губерта, Марціна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



■ А не шкодзь!

І ПАДАТАК, І ПАКАРАННЕ

Жыхар г. п. Карэлічы гандляваў запчасткамі, якія набываў у нелегальных пастаўшчыкоў.

На працягу чатырох гадоў індывідуальны прадпрымальнік Аляксей Ш. набываў запасныя часткі за наяўныя сродкі, а паступленне тавару фіксаваў у бухгалтарскіх і падатковых дакументах ілжэпрадпрымальніцкіх структур. Гэту схему раскрылі супрацоўнікі Лідскага міжрайаддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гродзенскай вобласці. Запазычанасць па падатках у прадпрымальніка склала больш чым 80 тыс. рублёў. Суд прызнаў Аляксея Ш. вінаватым ва ўхіленні ад падаткаў у асабліва буйным памеры і прызначыў пакаранне з пазбаўленнем волі тэрмінам на тры гады з канфіскацыяй маёмасці.

Маргарыта УШКЕВІЧ

Даты Падзеі Людзі

3 ЛІСТАПАДА

1882 год — нарадзіўся Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), класік беларускай літаратуры, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў (з Я. Купалам) сучаснай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы, акадэмік НАН Беларусі (1928), народны паэт Беларусі (1926), заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Памёр у 1956 годзе.

1912 год — нарадзіўся (в. Астрагляды, цяпер у Брагінскім раёне) Вячаслаў Пятровіч Палескі (сапр. Станкевіч), беларускі драматург, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. З 1930 года працаваў у газетах: «Палеская праўда», «Савецкая Беларусь», «Калгаснік Беларусі», «Звязда». У 1961—1971 гадах — у Дзяржаўным камітэце СМ Беларусі па радыёвяшчанні і тэлебачанні (з 1965 года — старшыня). Аўтар п'ес «Песня нашых сэрцаў», «Калі зацвітаюць сады», «Гарачыя пірагі». Памёр у 1971 годзе.

1932 год — нарадзіўся (вёска Вялікая Дайнава Валожынскага раёна) Іван Іванавіч Ліштван, беларускі вучоны ў галіне калоіднай хіміі, фізікахіміі торфу. Акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, замежны член Польскай акадэміі навук, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі. Аўтар больш чым 1000 навуковых прац, у тым ліку 35 манаграфій, навучальных дапаможнікаў, брашур, 75 вынаходак. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

1942 год — нарадзіўся (Пружанскі раён) Пётр Пятровіч Пракаповіч, беларускі дзяржаўны дзеяч, заслужаны будаўнік Беларусі, герой Беларусі. У 1996—1998 гадах быў намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, першым намеснікам прэм'ер-міністра. З 1998 па 2011 год — старшыня праўлення Нацыянальнага банка. У 2012—2013 гадах працаваў памочнікам Прэзідэнта.

1957 год — у Савецкім Саюзе ажыццёўлены вывад на арбіту другога штучнага спадарожніка Зямлі; на яго борце знаходзілася невялікая кабіна з сабакам Лайкай, які пражыў у космасе ў стане бязважкасці каля тыдня і стаў першай «рассакрэчанай» жывой істотай, якая заваявала касмічную прастору.

Было сказана

Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт, перакладчык:
Мы ўжо не просім міласці ў прыроды,
Прырода моліць літасці у нас.

УСМІХНЕМСЯ

Памяць у мяне так сабе. Але калі іду ў краму па піва, з ліманадам дакладна не вярнуся.

Муж шукае пасведчанне аб шлюбе.

— Соня, дзе гэтая паперка пра маё пажыццёвае зняволенне?

— Фіма, памаўчы! Гэта ж твой пажыццёвы абанемент на трохразовае харчаванне!

У сям'і бюракратаў бацька не змог сабраць патрэбны пакет дакументаў, каб паставіць сына ў кут.

— Сынок, схадзі ў магазін.

— А чароўнае слова?

— Адключу інтэрнэт.

— Ужо бягу!!!

Помні галоўнае — у цябе склероз!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4152. Нумар падпісаны ў 19.30 2 лістапада 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12